УДК 903.4 (476.6)

## АРХЕАЛАГІЧНЫЯ ПОМНІКІ КРУГЛЯНСКАГА РАЁНА: ВЫНІКІ ДАСЛЕДАВАННЯЎ 2014–2015 гг.

Коласаў Аляксандр Уладзіміравіч
прафесар кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін установы адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова»;
кандыдат гістарычных навук, дацэнт
(г. Магілёў, Беларусь)

*Артыкул падводзіць вынікі інвентарызацыі помнікаў археалогіі на тэрыторыі Круглянскага раёна Магілёўскай вобласці ў 2014–2015 гг. Улічана 47 помнікаў: два гарадзішчы і 15 селішчаў ранняга жалезнага веку і сярэдневякоўя, 21 курганны могільнік, 9 адзінкавых курганоў.*

У адпаведнасці з дамовай паміж аддзелам ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Круглянскага райвыканкама і МДУ імя А.А. Куляшова ў 2014–2015 гг. была праведзена інвентарызацыя помнікаў археалогіі на тэрыторыі Круглянскага раёна Магілёўскай вобласці. Работы фінансаваліся за кошт сродкаў мясцовага бюджэту і былі накіраваны на ўлік, вывучэнне стану і захаванасці археалагічных аб'ектаў для ўключэння іх у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

Правядзенню работ у Круглянскім раёне папярэднічала непрыемная сітуацыя. У жніўні 2014 г. каля в. Арава па загаду кіраўніцтва ААТ «Круглянскі аграпрамтэхзбыт» была разворана частка курганнага могільніка IX–XI стст., размешчаная ў полі. Факт знішчэння помніка выклікаў у грамадстве шырокі рэзананс і знайшоў сваё асвячэнне ў СМІ [гл., напрыклад: 2]. Аднак на гэтым усё і скончылася. Справа па арганізацыі выратавальных работ з боку навукоўцаў на помніку далей не пайшла. На месцы знішчанага могільніка, на ворыве, захаваліся светлыя плямы акруглай ці авальнай формы ад былых насыпаў. У асобных з іх сустракаюцца рэшткі попельных плям.

Знаёмства з літаратурай паказала, што апошні раз суцэльнае археалагічнае вывучэнне тэрыторыі Круглянскага раёна праводзілася яшчэ ў 1989 г. пад кіраўніцтвам В.Ф. Капыціна. Вынікі падсумаваны ў асобнай манаграфіі даследчыка «Археологические памятники Круглянского района Могилевской области» (Могилев, 1991) [1]. У гэтым выданні пазначана 29 помнікаў і адно месцазнаходжанне каменнай свідраванай сякеры каля в. Кунцы [1, с. 18–23]. Значная частка прадстаўлена курганнымі пахаваннямі – 18 помнікаў. Таксама былі вядомы: адна стаянка эпохі неаліту – бронзавага веку каля в. Малая Арава, шэсць селішч ранняга жалезнага веку і эпохі сярэднявечча, тры гарадзішчы. Чатыры помнікі аказаліся знішчанымі – два гарадзішчы каля в. Цяцерын і два курганных могільніка (Старая Радча і Ліпск). В.Ф. Капыціна таксама непакоіў стан большасці археалагічных помнікаў, якія падвяргаліся разворванню, ці разбураліся падчас кар'ерных і будаўнічых работ [1].

У выніку інвентарызацыі, праведзенай на тэрыторыі Круглянскага раёна ў 2015 г., улічана 47 аб'ектаў. Сярод іх: два гарадзішчы і 15 селішчаў ранняга жалезнага веку і сярэдневякоўя, 21 курганны могільнік, 9 адзінкавых курганоў. Стала відавочным, што інфармацыя аб стане і захаванасці помнікаў археалогіі ў раёне значна састарэла. Звесткі аб месцазнаходжанні і колькасці асобных помнікаў, як паказалі нашы работы, аказаліся недакладнымі.

Узгаданы вышэй пералік археалагічных помнікаў паказвае поўную адсутнасць паселішчаў каменнага і бронзавага вякоў. Абследаваць стаянку каля в. Малая Арава, якая знаходзілася на левым беразе р. Друць, за 0,2 км вышэй вусця р. Бярозаўка, не з'яўляецца магчымым. Мясцовасць з моманту апошняга даследавання помніка (В.Ф. Капыцін, 1989 г.) значна змянілася: левы бераг р. Друць парос хмызняком і дрэвамі, ды і сама в. Малая Арава фактычна перастала існаваць. Між іншым аб наяўнасці каля вёскі слядоў старажытнага паселішча сведчыць знаходка крамянёвага наканечніка стралы ромбападобнай формы (позні неаліт – бронзавы век), апрацаванага з дзвух бакоў. Адзіная знаходка – праксімальная частка крамянёвай пласціны – была сустрэта ў час абследавання паселішча XVI–XVIII стст. каля в. Касцюковічы. Станоўчых вынікаў не дало і вывучэнне разораных тэрас, пясчаных узгоркаў на р. Друць каля вв. Арава, Васільеўка, Зарэчча, Прыгані 3, Ракушава, Шупені; на р. Каменка (в. Касцюковічы); на р. Вабіч (вв. Азёры, Тубышкі).

Значыць ці гэта, што на тэрыторыі Круглянскага Падруцця няма перспектыў пошуку помнікаў больш ранейшых, чым жалезны век? Наяўнасць адзінкавых знаходак з крэменю каля вв. Малая Арава і Касцюковічы дазваляе лічыць іх выпадковымі, але не пакідае спадзяванняў у магчымасці адкрыцця на тэрыторыі раёна месцазнаходжанняў каменнага і бронзавага вякоў.

Больш выразныя матэрыялы атрыманы ў выніку вывучэння паселішчаў ранняга жалезнага веку і сярэдневякоўя. Яны вядомы на р. Друць каля вв. Васільеўка, Зарэчча (3 помніка), Малая Арава, Прыгані 3, Ражкі, Ракушава (2 помніка). Асобныя помнікі знаходзяцца на прытоках Друці – безназоўных ручаях рр. Бярозаўка (Варгуццева, Красіна) і Каменка (2 помніка каля в. Касцюковічы). Два паселішча размешчана на воз. Безыменнае (басейн р. Вабіч) каля в. Азёры. Новыя селішчы адкрыты каля вв. Азёры (2 помніка), Зарэчча (селішча-2 і 3), Касцюковічы (2 помніка), Красіна, Малая Арава, Ражкі, Ракушава (2 помніка).

Сярод матэрыялаў – фрагменты ляпной керамікі ранняга жалезнага веку (Васільеўка, Зарэчча-1, Зарэчча-2, Зарэчча-3, Прыгані 3), асобныя з якіх маюць гладкую паверхню і расчосы (Васільеўка, Зарэчча-1, Зарэчча-2); ляпная кераміка, падпраўленая на ганчарным крузе (Васільеўка, Ракушава-2, Прыгані 3), кругавая кераміка старажытнарускага часу (Азёры-2, Варгуццева, Васільеўка, Зарэчча-1, Зарэчча-2, Прыгані 3, Ракушава-1, Ракушава-2) і позняга сярэдневякоўя (Азёры-1, Азёры-2,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Варгуццева, Васільеўка, Зарэчча-1, Зарэчча-3, Касцюковічы-1, Касцюковічы-2, Красіна, Малая Арава, Прыгані 3, Ракушава-2, Ражкі). На паселішчы XIV–XVIII стст. каля в. Красіна сустрэты фрагменты тэракотавай посудападобнай і каробкавай кафлі з палівай зялёнага колеру, асколкі ад шкляных пасудзін і бутэляк.

На тэрыторыі раёна вядомы рэшткі дзвюх гарадзішч. Адно з іх знаходзіцца каля в. Прыгані 1, на мысе паміж левым берагам р. Друць (Цяцеранскае вадасховішча) і левым берагам ручая Бліноўка, за 0,2 км на паўночны ўсход ад вёскі. Другое гарадзішча захавалася на левым беразе р. Можа, каля былой в. Казёл.

На тэрыторыі раёна налічваецца 30 помнікаў з пахаваннямі курганнага тыпу. Сярод іх захаваліся адзінкавыя насыпы (Александрова, Бялаўка (Ваўкаўшчына), Варгуццева, Казёл); Ражкі (два помніка), Шупені (тры адзінкавыя курганы). Могільнікі таксама ўтвараюць групы з двух (Красуля, Зарэчча (курганны могільнік-2), Хралішчава) і больш курганоў – Арава, курганны могільнік-1 (тры насыпы), Зарэчча, курганны могільнік-3 (3), Азёры, курганны могільнік-1 (3), Комсенічы (4), Шапялевічы (4), Ракушава (6), Свабода (Казіміроўка) (8), Азёры, курганны могільнік-2 (9), Зарэчча, курганны могільнік-1 (9), Варгуццева (11), Тубышкі (11), Арава, курганны могільнік-2 (12), Ахімкавічы-1 (13), Гоенка (14), Зарэчча, курганны могільнік-4 (15), Васільеўка (23), Шупені (43), Круглае (65). Новыя курганныя пахаванні сталі вядомы каля вв. Азёры (курганны могільнік-2), Ахімкавічы-1, Варгуццева, Казёл, Комсенічы, Круглае, Ракушава, Тубышкі.

З улікам стану і захаванасці пахаванняў, статус некаторых помнікаў змяніўся. Так, з шасці насыпаў курганнага могільніка-1 каля в. Шупені, пра які ўзгадваў В.Ф. Капыцін [1, с. 20], захавалася толькі тры. Адлегласць паміж курганамі складае 300–360 м. Таму з пункту гледжання арганізацыі ахоўных мерапрыемстваў мэтазгодна разглядаць кожны з курганоў як асобны помнік.

З такіх пазіцый быў разгледжаны статус курганных пахаванняў каля в. Зарэчча. Па звестках В.Ф. Капыціна, які адкрыў помнік у 1977 г. і адзначыў у ім наяўнасць 14 курганоў, могільнік быў выцягнуты ўздоўж рэчышча р. Друць на працягу каля 3 км [1, с. 21]. Агляд помніка сапраўды паказала значную (на 0,5–0,8 км) адлегласць паміж некаторымі насыпамі, што робіць немэтазгодным іх ўключэнне ў адзіную прастору помніка з пункту гледжання арганізацыі ахоўных мерапрыемстваў. На падставе гэтага было вылучана тры групы курганных могільнікаў, якія ўтрымоўваць дзевяць (курганны могільнік-1), два (курганны могільнік-2) і тры насыпы (курганны могільнік-3).

Адносна захаванасці курганных могільнікаў на тэрыторыі раёна з моманту работ В.Ф. Капыціна яшчэ ў 1989 г. мала што змянілася. Шэраг пахаванняў знаходзіцца ў зоне інтэнсіўнага вядзення сельскагаспадарчых работ, падножжа насыпаў каля вв. Александрова, Васільеўка, Красуля, Ражкі, Свабода (Казіміроўка), Хралішчава, Шупені (курган-3) парушана ворывам. Практычна кожны могільнік пашкоджаны скарбашукальніцкімі раскопкамі.

Акрамя могільніка каля в. Арава (захавалася толькі 12 курганоў, размешчаных ў лесе), можна канстатаваць фактычна поўнае знішчэнне курганнага некропаля каля в. Варгуццева. Тут са 121 вядомага раней кургана захавалася толькі 11 насыпаў. Больш таго, па звестках В.Ф. Капыціна [1, с. 21] могільнік знаходзіўся каля сельскіх могілак, што не адпавядае сапраўднай сітуацыі. Могілкі размешчаны на правым беразе ручая, пераўтворанага тут у вадасховішча, а рэшткі курганнага могільніка – на левым беразе вадаёма. Лінія правага берага пашкоджана шматлікімі кар'ернымі выпрацоўкамі, якія маглі ўзнікнуць у час будаўніцтва вадасховішча. Адзінае сведчане аб прысутнасці тут помніка археалогіі – курган, які захаваўся на тэрыторыі могілак.

Даследаванне левага берага ручая (паўночны бераг вадасховішча), на якім указвалася месцазнаходжанне 121 кургана, таксама паказала перабудову ландшафта. На месцы, дзе знаходзіўся курганны могільнік, прысутнічаюць зарослыя маладым лесам і хмызняком дзялянкі. Устаноўлена, што пры распрацоўке лесу рабілася не толькі выкарчоўка дрэў, якой былі сапсаваны курганы, але і нівеліроўка плошчы пад дзялянкі.

У межах асобных помнікаў, на сельскіх могілках каля вв. Ахімкавічы-1, Бялаўка, Варгуццева, Казёл, Кляпінічы, Комсенічы, Рублёўск, Тубышкі агледжаны каменныя крыжы і надмагільныя камяні. На асобных з іх захаваліся выявы крыжоў, крыжоў на падстаўцы (тып Галгофа), крыжоў, акрэсленых колам, надпісы аб часе пахавання нябожчыка, яго імя (Бялаўка, Казёл). Храналагічны дыяпазон каменных выяваў адпавядае XVII–XX стст.

Такім чынам, атрыманыя ў 2014–2015 гг. матэрыялы па археалогіі Круглянскага раёна дазволілі ўдакладніць звесткі аб стане і захаванасці помнікаў, стварыць перадумовы для далейшых пошукаў і вывучэння.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**


1. Копытин, В. Ф. Археологические памятники Круглянского района Могилёвской области / В. Ф. Копытин. – Могилев : Облтипография, 1991. – 52 с.
2. Минченко, П. Прошлись плугом по истории / П. Минченко // Советская Белоруссия. – 2016. – 9 октября. – № 193 (24574).


Электронный архив Библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова